Прэзентацыя падрыхтавана І. Я. Андрэевай



# Пад сценамі старажытных замкаў

Мая Радзіма — Беларусь

4 клас

Образовательная компания «Содействие»

**МЭТА:** паказаць ролю замкаў як буйных і добра ўмацаваных пунктаў абароны ад ворагаў.

**ЗАДАЧЫ:**

— даць агульнае ўяўленне аб старажытных замках Беларусі, пазнаёміць з галоўным прызначэннем гэтых магутных збудаванняў, іх знешнім выглядам і памерамі, а таксама сучасным станам замкаў;

— развіваць цікавасць да мінулага нашай краіны, пабуджаць да краязнаўчай і пашуковай работы;

— выхоўваць павагу да нашых далёкіх продкаў, якія сваімі працавітымі рукамі ўзводзілі велічныя збудаванні, каб абараняць ад ворагаў свой край.

Образовательная компания «Содействие»

# Праверка дамашняга задан

**Гульня «Хто хутчэй»**

Образовательная компания «Содействие»

**Заданне 1.** ***З дапамогай стрэлак правільна суаднесці назвы гарадоў і даты:***

| | |
|---|---|
| Мінск | 862 г. |
| Тураў | 980 г. |
| Полацк | 1067 г. |
| Віцебск | 974 г. |
| Гродна | 1267 г. |
| Брэст | 1142 г. |
| Гомель | 1019 г. |
| Магілёў | 1127 г. |

Образовательная компания «Содействие»

## Заданне 2. *Перавесці гады ў стагоддзі:*

Полацк — 862 г. — IX ст.
Віцебск — 974 г. — ? X ст.
Тураў — 980 г. — ? X ст.
Брэст — 1019 г. — ? XI ст.
Мінск — 1067 г. — XI ст.
Гродна — 1127 г. — ? XII ст.
Гомель — 1142 г. — ? XII ст.
Магілёў — 1267 г. — ? XIII ст.

Образовательная компания «Содействие»

## Заданне 3. Хто хутчэй нанясе на стужку часу даты ўзнікнення гарадоў?




Образовательная компания «Содействие»

**Заданне 4.** Якія гарады носяць назвы рэк?

Полацк, Віцебск, Мінск, Гомель.

**Заданне 5.** Якія гарады ў наш час з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі?

Мінск, Віцебск, Гомель, Магілёў, Гродна, Брэст.

**Заданне 6.** Вызначыць назвы гарадоў, якія паходзяць:

- ад падання пра магілу Льва; Магілёў.
- ад імя князя; Тураў, Магілёў.
- ад назвы пароды дрэва; Брэст.
- ад ваеннага назначэння. Гродна.

Образовательная компания «Содействие»

# План

1. Назначэнне замкаў.
2. Лідскі і Крэўскі замкі.
3. Замак у Гародне.
4. Сынкавіцкая царква.
5. Замкі ў Міры, Нясвіжы і Гальшанах.

Образовательная компания «Содействие»



# Чаму большасць замкаў
# узводзілася на межах краі

Образовательная компания «Содействие»



**Замак** — гэта добра ўмацаванае збудаванне, прыстасаванае для працяглай абароны.

Образовательная компания «Содействие»

# Маршрут падарожжа

Ліда → Крэва → Гродна →

→ Сынковічы → Мір →

→ Нясвіж → Гальшаны

Образовательная компания «Содействие»



# Лідскі замак

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



# Цікава ведаць

**Лідскі замак** пабудаваны ў 1330 гг. паводле даручэння князя Гедыміна. Уваходзіў у лінію процікрыжацкай абароны Навагрудак — Крэва — Меднікі — Трокі. Замак быў збудаваны з бутавага каменю і цэглы, меў у плане форму няправільнага чатырохвугольніка з дзвюма вуглавымі вежамі, і быў пастаўлены на насыпным пясчаным узгорку, абкружаным балоцістымі берагамі рэк Лідзея і Каменка, з поўначы — ровам шырынёй каля 20 м, які злучаў гэтыя рэкі і аддзяляў замак ад горада. Пазней (верагодна, у XVI—XVII ст.) у сістэму перадзамкавых умацаванняў з усходу было ўключана штучнае возера. На замкавым двары размяшчаліся праваслаўная царква (у 1533 г. перанесена ў горад), жылыя і гаспадарчыя пабудовы, з 1568 г. — суд, архіў, астрог. Жылыя памяшканні мясціліся на вышэйшых паверхах вежаў.

У 1891 г. Ліда згарэла, прычым агонь спляжыў яе цэнтр, разам з будынкам ратушы XVIII ст. Гарадскія ўлады пачалі разборку і распродаж замкавых муроў, выкарыстоўваючы іх для адбудовы горада. З адхонаў замкавага пагорка сталі браць пясок. Тады былі амаль цалкам знішчаны рэшткі паўднёва-заходняй вежы і разабрана частка заходняй сцяны. Толькі ўмяшанне археалагічнай імператарскай камісіі з Пецярбурга спыніла гэты вандалізм.

Образовательная компания «Содействие»





# Крэўскі замак

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»

# Цікава ведаць

**Крэўскі замак** — комплекс абарончых збудаванняў каля вёскі Крэва Смаргонскага раёна. Пабудаваны ў XIV ст. (ёсць падставы меркакаць, што будаўніцтва пачалося ў канцы XIII ст.) каля сутокаў рэк Краўлянка і Шляхцянка. Асноўная частка збудаванняў замка была размешчана на балоцістым поплаве, палова абарончых муроў узведзена на штучна расшыранай пясчанай дзюне.

Замак на плане — няправільны чатырохвугольнік, абнесены мураванымі сценамі. Паўночная сцяна даўжынёй 85 м, усходняя — 108,5 м, паўднёвая — 71,55 м, заходняя — 97,2 м. Таўшчыня сцен 2,5—3 м, вышыня каля 12—13 м. Сцены да вышыні 3 м вымураваны з камянёў, вышэй — з цэглы. Уязная брама знаходзілася ў паўднёва-ўсходняй сцяне. На замкавым двары размяшчалася кузня, жылыя пабудовы, мелася сажалка.

Яшчэ ў XVIII ст. Крэўскі замак быў у добрым стане. Пазней пачалося яго разбурэнне, якое давяршыла Першая сусветная вайна, калі праз Крэва праходзіла лінія фронту і больш як 3 гады вяліся пазіцыйныя баі. Замак апынуўся на тэрыторыі, захопленай немцамі, тут былі збудаваны сховішчы і назіральныя пункты. Пад час абстрэлаў асабліва моцна пацярпела Княжацкая вежа і сцены ў паўднёвай частцы замка. Да нашых дзён захаваліся толькі замкавыя руіны.

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



**Стары замак у Гродна**

Образовательная компания «Содействие»





Образовательная компания «Содействие»



# Цікава ведаць

**Стары замак у Гродна** пабудаваны рускімі князямі ў XI ст. У XIII ст. Гродна разам з замкам перайшло пад уладу Літвы. З пачатку наступнага стагоддзя горад шмат разоў падвяргаўся нападкам крыжакоў. У 1391 г. Стары замак стаў адной з галоўных рэзідэнцый Вітаўта, які ў 1398 г. пабудаваў каменны замак з пяццю башнямі. Гэты будынак у асноўным і захаваўся да нашага часу. Вельмі часта спыняўся тут Стэфан Баторый, які зрабіў Гродна фактычнай сталіцай Рэчы Паспалітай.

У 1655 г. замак быў увесь разбураны рускімі войскамі ў час руска-польскай вайны 1654—1667 гг. Адбудаваў яго літоўскі канцлер і гродзенскі стараста Кшыштаў Зігмунд Пац. У пачатку XVIII ст. замкавы будынак быў знішчаны шведамі ў час Паўночнай вайны. У сярэдзіне XVIII ст. стагоддзя быў пабудаваны **Новы замак**, а Стары замак ў XIX ст. быў перабудаваны ў царскія казармы.

Зараз замак адрамантаваны і выкарыстоўваецца ў якасці музея.

Образовательная компания «Содействие»



**Сынковіцкая царква-крэпасць**

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



**Мірскі замак**

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»

# Цікава ведаць

**Мірскі замак** — помнік архітэктуры, знаходзіцца ў г. п. Мір. Замак пабудаваны ў XVI—XVII стст. на месцы драўлянай сядзібы. Збудаваны з цэглы і камення. Да 1568 г. замкам валодалі князі Ілінічы, потым Радзівілы (да 1828 г.), Вітгенштэйны (да 1891 г.), Святаполк-Мірскія (да 1939 г.).

У параўнанні з іншымі замкамі Беларусі Мірскі замак захаваўся да XXI ст. ў адносна добрым стане. Зараз завяршаюцца работы па яго рэканструкцыі.

У 2000 г. Мірскі замак уключаны ЮНЕСКА ў Спіс сусветнай спадчыны.



Образовательная компания «Содействие»



Нясвіжскі замак

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»





# Цікава ведаць

Першае згадванне аб будаўніцтве **Нясвіжскага замка** датуецца 1551 г. і прыпісваецца Мікалаю Радзівілу Чорнаму. У 1580-х гг. пры Мікалаю Радзівіле Сіротку замак быў перабудаваны і прадстаўляў прастакутнік прыкладна 170 на 120 метраў з некалькімі таемнымі ўваходамі-выхадамі. Паводле размешчанай над уваходам у замак закладной пліце, перабудова была завершана 7 мая 1583 г.

У 1706 г. падчас Паўночнай вайны замак быў захоплены шведскімі войскамі і ператвораны ў ваенны бастыён, шматлікае ў замку было разбурана. Толькі ў канцы 1720-х гг. пачалася рэканструкцыя, а ў 1740 г. пабудавана палацавая капліца.

У 1812 г. уладальнік замка Дамінік Еранім Радзівіл выступіў на баку французскага войска, пасля чаго змушаны быў збегчы. Толькі ў 1860 гг. замак вярнуўся да Радзівілаў, пасля чаго пачалося яго пашырэнне і будаўніцтва ўласна комплексу: Замкавы парк, Стары парк, Японскі сад, Новы парк, Англійскі парк. Агульная плошча усяго комплексу да 1939 г. складала каля 90 гектараў, пасля чаго ў часы СССР у комплексе размяшчаўся санаторый.

Образовательная компания «Содействие»



**Замак у Гальшанах**

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»

# Цікава ведаць

**Замак у Гальшанах** быў пабудаваны Паўлам Стэфанам Сапегай на мяжы XVI і XVII стст. у некалькіх кіламетрах ад старога замка Гальшанскіх. Ад радавога гнязда Гальшанскіх засталося зусім няшмат, а вось на замак Сапег, дакладней на яго руіны, можна паглядзецъ.

У пачатку XVIII ст. у час Паўночнай вайны замак быў моцна пашкоджаны шведскімі войскамі.

Образовательная компания «Содействие»






Уладзімір Караткевіч у сваім рамане «Чорны замак Альшанскі» расказаў пра трагічную гісторыю, якая даўным-даўно адбылася ў гэтым замку.

Образовательная компания «Содействие»



Образовательная компания «Содействие»

# Чаму большасць замкаў узводзілася на межах краіны?

Каб стрымаць націск ворагаў. Большасць замкаў пабудавана ў заходняй частцы Беларусі. Найбольш небяспечнымі ворагамі былі крыжакі, якія наступалі з захаду.

Образовательная компания «Содействие»